Т. П. Хоміч
г. Мінск

# Матыў *страчанага раю* ў лірыцы Аляксея Пысіна

Фарміраванне таленту паэта Аляксея Пысіна адбывалася пад уплывам традыцыйных сялянскіх маральна-этычных нормаў і ўяўленняў, што складваліся на працягу стагоддзяў і ў многім грунтаваліся на агульнахрысціянскім кодэксе духоўнасці. Аднак арыентацыя савецкага грамадства на засваенне атэістычных поглядаў, пільнасць з боку цэнзуры, службовая пасада (карэспандэнт "Магілёўскай праўды", у 1974–1981 гг. – сакратар Магілёўскага абласнога аддзялення СП БССР) не дазвалялі А. Пысіну дакладна акрэсліць сваё стаўленне да веры, рэлігіі. Хоць, па словах дачкі [аўдыёзапіс размовы – красавік 2001 г. – захоўваецца ў архіве аўтара], А. Пысін падчас шматлікіх пісьменніцкіх камандзіровак з вялікай ахвотай наведваў царкоўныя храмы. На думку Галіны Аляксееўны, гэта была падсвядомая цікавасць да веры, якую шанавала вельмі паважаная А. Пысіным яго маці, а таксама "*баба Варачка*" – цешча Аляксея Васільевіча. У 1960–70-я гг. паэт не мог свабодна апеляваць да біблейскіх сюжэтаў, як робіць гэта, напрыклад, сучасная паэзія (цікавы ў гэтым сэнсе вопыт Р. Барадуліна – зборнікі "Евангелле ад Мамы" – 1995, "Ксты" – 2006), таму што выказванне прыхільнасці да рэлігіі ў савецкія часы пагражала сур'ёзнымі наступствамі.

У творчасці А. Пысіна яўныя біблейска-хрысціянскія вобразы і сюжэты адсутнічаюць, але алюзіі на іх відавочныя. Так у вершы "Даўно апусцелі саборы…" выяўляецца трагедыйнасць быцця чалавека, у якога адабралі самае сутнаснае, адабралі тое, што лучыла яго душу з верай продкаў, іх культурна-гістарычным вопытам: "*Даўно апусцелі саборы, // Даўно не шануем багоў. // Электраліній апоры // Нясуць адпушчэнне грахоў*". І як бы аўтар не імкнуўся ўзнёсла, нават пафасна сцвердзіць святло высокай праўды сваёй эпохі ("*Свяці мне высокая праўда // Мільярдам сваіх кілават*" [3, с. 201]), прысмак гаркоты застаецца: страцілі храм душы, перастаўшы шанаваць багоў, адвярнуўшыся ад спрадвечных маральных ісцін. Сумяшчэнне ж у адным творы розных пластоў духоўнага быцця (ад хрысціянскай веры да савецкай ідэйнасці) сведчыць пра спалучэнне розных светапоглядных тэндэнцый пры выяўленні А. Пысіным космасу быцця беларуса сярэдзіны ХХ ст.

Зафіксаваная паэтам і яго лірычным героем страта маральнасці, духоўнасці ў чалавечым грамадстве па-мастацку выявілася ў матыве *страчанага раю*. Нават дапусціўшы, што творца не быў знаёмы з хрысціянскімі крыніцамі (напрыклад, В. Арцем'еў, блізкі сябра паэта, у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

артыкуле “Бібліятэка Аляксея Пысіна” [1] сярод кніг, якія чытаў пісьменнік, не называе Біблію), усё ж можна меркаваць, што класічныя евангельскія вобразы *рай*, *райскае дрэва* былі яму вядомы. Лірычны герой паэта знаходзіцца ў стане пошуку райскага дрэва, якое нібыта дасць магчымасць “*мудрага пазнання дабра ці зла*”, аднак адказам яму “*струменіць цішыня*”: “*Маўчаць сады. // Маўчаць*” [3, с. 214–215].

Пошук “*раю зямнога*” [3, с. 245] не прыносіць плёну, рэальнасць не абнадзейвае: “*даўно зямля без райскай зоны // І мы як грэшнікі на ёй*” [3, с. 257]. Паэт разумее, што той райскі свет, які ён шукае, які напоўнены духоўнасцю, дабратой, адзінствам чалавека і прыроды, “*выдаваўся не на сотні год*” [3, с. 245]. У 1980–90-я гг. ідэя страчанасці зямнога раю атрымае новае мастацкае ўвасабленне ў прозе В. Казько. Разбурэнне часам, грамадствам, людзьмі спрадвечных духоўных ідэалаў, арыенціраў прыводзіць да парушэння экалагічнай збалансаванасці. Ствараючы мастацкую мадэль быцця сучаснага чалавека ў свеце (раман “Неруш”, аповесць “Выратуй і памілуй нас, чорны бусел”), празаік даследуе прычыны, якія ставяць чалавека, грамадства (і цывілізацыю ў цэлым) перад глабальнай пагрозай знікнення прыроднага раю, перад небяспекай прыродна-экалагічнага апакаліпсісу. А. Пысін, як бачым, ужо і ў свае 1960-я ўсведамляў, што зямны Эдэм, духоўны і прыродна-экалагічны, загублены векам калі не беспаваротна, то на доўгія гады.

Матыў *страчанага раю* канкрэтызуецца ў лірыцы паэта з дапамогай топасу *сад*. Згодна з хрысціянскімі вераваннямі, сады ў разуменні многіх пакаленняў чалавецтва былі “раем зямным”: “У іх павінна быць усё прыгожа: для вачэй, для слыху (спяванне птушак, цурчанне вады, рэха), для нюху (пахі кветак і духмяных траў). У іх павінна быць багацце ўсяго і вялікая разнастайнасць, што сімвалізуе багацце свету” [2, с. 73]. У спадчыне А. Пысіна няшмат мастацкіх твораў, дзе лірычны герой непасрэдна ўключаны ў прастору саду (“Вячэрні сад. Над лісцем сонным…” – 1965, “Сады, як белагрудыя мядзведзі...”, 1967, “Белыя яблыні, белыя…” – 1968, “Стаілася ў яблынях вёска…” – 1979 і інш.). Тым не менш сад стаў запамінальным і неадлучным ад іншых топасаў у паэтычным свеце лірыка.

У прасторы пысінскага саду часам, сапраўды, адчуваецца нешта райскае: надзвычайная гармонія, касмічнасць (“*Там, пад нябачнымі высямі, // Зоры і яблыкі выспелі*” [3, с. 232]). Створаны рукамі чалавека сад-цуд, успрымаецца паэтам і як прастора яднання продкаў і нашчадкаў. Вядома, што ў нашай мове ды і ў іншых мовах свету слова “сад” сімвалізуе доўгае мірнае жыццё, якое ідзе ад прадзедаў да праўнукаў. У А. Пысіна ўжо ў адным з ранніх вершаў сад асэнсоўваўся як сімвал пераемнасці пакаленняў: “*Хай жа поіць бярозавы сок // Тых, хто нашымі ходзіць*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*садамі*” [3, с. 46] (“Сок бяроз і начлежны дымок...”, 1957). Такая сімволіка захавалася і ў пазнейшых творах: “*Яблык ад яблыні коціцца // Ў рукі таму, хто народзіцца*” [3, с. 232].

Але і ў гэтай рукатворнай, нібыта ідэальнай мадэлі свету – садзе, лірычны герой не знаходзіць “духоўнага раю”. Яшчэ раз нагадаем радкі з твора “Сады, як белагрудыя мядзведзі...”: “*Маўчаць сады. // Маўчаць*”. У гэтым вершы (ён, на наш погляд, уяўляе сабой выдатны ўзор філасофска-медытатыўнай лірыкі) выкарыстаны ўсе магчымыя спосабы ўспрыняцця лірычным героем прасторы саду:

*Сады, як белагрудыя мядзведзі,*
*Павіслі на рагацінах падпор.*
*Сцвярджаючы, што дол і высь – суседзі,*
*Сышліся ярусы пладоў і зор.*

*Паўзе туман з нізін. Платы намоклі.*
*Струменіць цішыня.*
*І ля двара*
*Запахлі раптам дзедавы каноплі –*
*Прынада позняя для снегіра.* [3, с. 214–215]

Пысінскі герой ацэньвае прастору ў катэгорыях колеру (сады – “*белагрудыя*”), блізкасці/далёкасці (“*туман з нізін*” – “*і ля двара*”), верху/нізу (“*сышліся ярусы пладоў і зор*”). Яму ўласціва нюхавае ўспрыманне (пах “*канопляў*”) і кінестэтычнае (“*платы намоклі*”). Нават цішыню ў прасторы ён успрымае на слых, бо гэта “*гулкая*” цішыня – яна “*струменіць*”. Асноўныя аб’екты ў прасторы саду, на якія сфакусіравана ўвага лірычнага суб’екта, – яблыні і “*сузор’і яблык*”. У працэсе іх успрымання ўзнікаюць думкі аб спрадвечных загадках быцця, аб месцы дабра і зла ў гэтым свеце. У выніку прастора саду перажывае трансфармацыю, яна становіцца прасторай мінулага (жорсткага мінулага – вайны: “*Тады не райская гарэла брама. // І не спакуснік зваблівы дурэў*”), прычым на гэтую прастору наслойваецца яшчэ адна – уяўная: між “*счарнелых*” ад пажараў вайны дрэў “*віднеўся*” “*цень Адама*”. Прастора такім чынам пашыраецца, часы змешваюцца, драматызм ва ўспрыманні свету павялічваецца. Дарэчы, і ў іншых вершах прастора саду навявае трывожныя, балючыя перажыванні (“Вячэрні сад. Над лісцем сонным…”, “Стаілася ў яблынях вёска…”).

Тым не менш лірыку А. Пысіна нельга назаваць суцэльна песімістычнай, яго канцэпцыя свету не мае адценняў канчатковага расчаравання і безвыходнасці. Мы б сказалі, што лірычны герой знаходзіцца ў пастаянным руху ад драматычнага светаадчування да аптымістычнага. У апошніх радках верша “Сады, як белагрудыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мядзведзі...” сад становіцца сімвалам свету, які, нягледзячы на ўсе перыпетыі часу, вытрываў, не загінуў і захаваў духоўную аснову, закладзеную не сёння:

*Такія ж зоры, яблыкі такія,*
*Як год, як шмат гадоў таму назад...*
*І я кажу: не бойся, Еўдакія,*
*Ступіць у сённяшні прыціхлы сад.* [3, с. 215]

Аптымізм А. Пысіна трымаецца на веры ў адраджэнне першаснай чысціні рэчаіснасці, “*райскай зоны*” ў душах людзей і ў прыродным свеце: “*І ўсё ж нязбытнае зямное // Даступным хочацца лічыць. // Адчынім фортачку зімою, // А можа, ластаўка ўляціць!*” [3, с. 257]. Ластаўка ў кантэксце твора “Калісьці лес вечназялёны…” і ўсей лірыкі паэта разумеецца як сімвал дабра, духоўнасці, якія могуць захавацца ў свеце толькі дзякуючы чалавеку. Невыпадкова ў вершы “Свет блакітна-ружова-зялёны…” (1965) А. Пысін фармулюе маральны імператыў, які застаецца актуальным для ўсёй яго творчасці: “*Ўсё ад нас. // Зберагчы сёння трэба // Больш святла, цеплыні, дабраты*” [3, с. 173].

Нягледзячы на тое, што росквіт таленту А. Пысіна адбываўся ў часы індыфірэнтных (і нават ваяўнічых) адносін да рэлігіі, матыў *страчанага раю* ў лірыцы мастака мае агульнахрысціянскую, маральна-этычную аснову. Пры гэтым аўтарская думка пра страту духоўнасці рэалізуецца на сацыяльна-грамадскім і прыродна-экалагічным узроўнях. Яе канкрэтызацыі, раскрыццю і паглыбленню садзейнічаюць паэтычныя вобразы *райская зона*, *райскае дрэва*, прасторавы вобраз *сад*. Як індывідуальна-аўтарскае ў інтэрпрэтацыі матыву *страчанага раю* ўспрымаецца адначасовая наяўнасць драматызму светаадчування і аптымістычнай веры паэта, яго героя ў магчымасць адраджэння чалавекам спрадвечных духоўных каштоўнасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура:


1. Арцем’еў, В. Бібліятэка Аляксея Пысіна / В. Арцем’еў // Полымя. – 1995. – № 3. – С. 177–189.
2. Лихачев, Д. С. Земля родная / Д. С. Лихачев. – М.: Просвещение, 1983. – 255 с.
3. Пысін, А. Збор твораў: у 2 т. / А. Пысін. – Мінск: Маст. літ., 1989. – Т. 1: Вершы. – 399 с.